# ШТО ПАВЕДАЎ РЭМБРАНТ,

## ці Гісторыя аднаго дарэвалюцыйнага фота

**СКЛАДАННЕ радаводу — гэта захапляльны працэс, падобны на археалагічныя раскопкі ці работу дэтэктыва. Калі знаходзіш нейкія новыя факты аб продках, узнікае ўражанне, што натрапіў на скарб. Гэтак і ёсць!**
**Але, магчыма, на пачатак вывучэння сваіх каранёў вам нічога не будзе вядома пра сваіх прабабуль ці прадзядуль. Што тады рабіць?**

### Зазірнуць у бабулін альбом

Каб генеалагічнае дрэва атрымалася надзвычай галінастым і максімальна інфарматыўным, неабходна сабраць пра кожнага продка пэўны набор звестак: прозвішча, імя, імя па бацьку; месца і дата нараджэння; дата і месца пахавання; род дзейнасці; атрыманая адукацыя; веравызнанне; месца і дата шлюбу; колькасць дзяцей, братоў, сясцёр з пазначэннем поўнага прозвішча, даты і месца іх нараджэння. Шукаць такую інфармацыю будзем у наступным парадку:

**1. Старанна разбяром сямейны архіў.**

**2. Завітаем у госці да сваякоў і правядзём апытанне.**

**3. Сістэматызуем атрыманыя вынікі.**

**4. Падрыхтуемся да першага візіту ў дзяржаўны архіў і даведаемся, як працаваць з дакументамі.**

**5. Даследуем адкрытыя анлайн-базы ў інтэрнэце і іншыя віды крыніц па генеалогіі.**




Адваротны бок паспарту фотаатэлье «Рэмбрант».

Пра кожны этап пагаворым асобна. А пачнём з вывучэння дакументаў і фотаздымкаў, якія захоўваюцца ў вашай сям'і. Здымайце з антрэсоляў і пільна разглядайце ўсе сямейныя паперы: лісты, дзённікі, паштоўкі, граматы, характарыстыкі, пасведчанні аб узнагародах, вайсковыя, прафсаюзныя ці нават... тэатральныя білеты — гэта дапаможа атрымаць шмат цікавай, часам нечаканай, інфармацыі аб тым, кім былі і як жылі вашы старэйшыя родзічы. Асабліва карыснымі будуць пасведчанні аб нараджэнні, шлюбе, смерці, дыпломы, атэстаты, працоўныя кніжкі — з імі лягчэй за ўсё пачынаць пошук у дзяржаўных архівах. Звяртайце ўвагу ў першую чаргу на даты: у будаванні радаводу яны — ключавыя зыходныя пункты.

Пры даследаванні фотаздымкаў уключайце інтуіцыю і выкарыстоўвайце дэдукцыю, як сапраўдны Шэрлак Холмс! Шукайце подпісы на адваротным баку фотакарткі. Часам разам з азначэннем года, калі яна зроблена, пазначаецца і ўзрост сваяка, што дазваляе вылічыць год яго нараджэння. Ускрывайце рамкі са старымі фатаграфіямі. На адвароце можна знайсці таксама каштоўныя даты і іншыя пасланні продкаў. Фотакарткі сваякоў у ваеннай форме падкажуць, у якога роду войсках і ў якім чыне яны служылі і прыблізны год, калі зроблена фота. На гэтым этапе часта выяўляюцца прабелы ў сямейнай гісторыі ці, наадварот, з дакументаў адкрываюцца загадкавыя факты, пра якія вам захочацца даведацца больш.

Усе знойдзеныя дакументы і фотаздымкі адсканіруйце і захавайце ў лічбавым фармаце. Далей выкарыстоўвайце менавіта іх. Арыгіналы вярніце на месца, каб не згубіць важныя пасведчанні жыцця продкаў.



Сямейная пара Іона і Людзьвіка Пятрыла.

### Архангельскі з вуліцы Срэценка, 21

Ёсць шчаслівыя ўладальнікі ўнікальных дарэвалюцыйных фотаздымкаў, якія захоўваюцца ў іх сем'ях больш за сто гадоў. І менавіта такі рарытэт я трымаю ў руках (фота № 1). Фота зроблена ў фотаатэлье «Рэмбрант» прыкладна ў 1914—1917 гадах. З фатаграфіі з лёгкай усмешкай глядзіць на мяне вытанчаная, элегантна апранутая маладая жанчына. Твар трошкі адхілены, адкрыты лоб, гладкая прычоска. З-пад доўгай спадніцы, стыльна аздобленай шэрагам гузікаў, відаць модныя чаравікі з абцасамі, на руцэ — шлюбны пярсцёнак, на шыі — залочаны медальён, у якім у тыя часы захоўвалі на памяць пасмачку валасоў свайго дзіцяці.

Яе сужэнец — у чорным фраку, верхні гузік па модзе расшпілены, бездакорна белая кашуля, з бабачкай, туфлі начышчаны да бляску. Інтэлігентны, у акулярах, сабраны і падцягнуты. Быццам бліскучы лектар выступае перад публікай. Безумоўна, таленавіты фатограф выверыў да дробязяў іх позы, паварот галавы. Але позірк — далікатна мяккі, шчыра ветлівы, не спазіруеш, яго святло можа ісці толькі знутры, як і гармонія адносін паміж сабой у пары.

На адвароце — надрукаваны малюнак кветкі і надпіс: «Фатаграфія «Рэмбрант» С. М. Архангельскага, Масква, Срэценка, д. 21, вугал былога Сухараўскага завулка, тэл. 206-84. Здымкі вырабляюцца пры дзённым і электрычным асвятленні (І. Гекъ, Масква). Негатывы захоўваюцца» (фота № 2).

Сямейная пара на фота — мае дзядуля і бабуля: Іона і Людзьвіка Пятрыла. А сам фотаздымак — шанц даведацца аб важным перыядзе іх жыцця. Абодва яны родам з Шаўляйскага павета, Іона працаваў гадзіннікавым майстрам і быў прадстаўніком у швейцарскай фірме «Tissot». Людзьвіка служыла ў сямействе графа Нарышкіна. Прыкладна ў 1914 годзе яны пабраліся шлюбам у Рызе, а з пачаткам Першай сусветнай вайны з'ехалі ў Маскву. Потым ім давялося качаваць па Урале: Пярмі, Екацярынбургу, Нованікалаеўску. Напэўна, перад ад'ездам з Масквы Іона з Людзьвікай зайшлі ў фотаатэлье «Рэмбрант» і зрабілі тое самае фота, якое я трымаю ў руках. І вось калі я вызначу дату фотаздымка, то, магчыма, высветлю, калі дакладна яны адправіліся на Урал. І для гэтага ў мяне ёсць тры «ключыкі»: назва фотаатэлье, адрас і прозвішча фатографа.

Цікава, што фотаатэлье з назвай «Рэмбрант» у тыя часы былі фенаменальна папулярныя. Зазірнуўшы ў «Алфавітны спіс фатаграфічных фірм Расійскай Імперыі, 1839—1917 гады» на сайце: https://fototikon, я налічыла больш за паўсотні «Рэмбрантаў»: у Архангельску, Баку, Барнауле, Бранску, Беластоку, Варшаве, Вільне, Дзвінску, Ламжэ, Екацярынбургу, Казані, Кіеве, Львове, Адэсе, Ташкенце, Томску, Чыце, Уладзікаўказе, Санкт-Пецярбургу.

У Беларусі існавала тры фотастудыі «Рэмбрант»: у Брэст-Літоўску — па вуліцы Паліцэйскай, у доме Пружана; у Магілёве-Падольскім у атэлье з такой назвай працаваў фатограф А. Брунштэйн, а ў Мінску — Восіп Бернштэйн. У кнізе «Мінск: паштоўкі і фотаздымкі» Аляксандра Вялічкі ў спісе фатографаў дарэвалюцыйнага Мінска ўдакладняецца, што ў 1905 годзе фотаатэлье «Рэмбрант» размяшчалася па вуліцы Захар'еўскай, 71, у доме Зальцмана. Яе заснавальнік — мешчанін Восіп Бернштэйн атрымаў пасведчанне на занятак прафесійнай фатаграфіяй № 178/4 ад 20 студзеня 1900 г. І працаваў па гэтым адрасе ў 1910—1912 гадах. Пазней студыя знаходзілася па Захар'еўскай вуліцы, у доме Ельскага.

У Беларусі першыя фотамайстэрні з'явіліся ў 1860-х гадах. У Мінскай губерні дазвол атрымалі калежскі сакратар Карнэлій Бржэўскі з землямерам Прохаравым (1866 г.); у Магілёўскай губерні — вольнанаёмны чарцёжнік Мендзялей Талкачэўскі (1864 г.); у Гродзенскай губерні — мешчанін Ілья Штуман (1864 г.); у Віцебскай губерні — купец Пашкоўскі (1863 г.). У канцы XIX стагоддзя ў Мінску працавала чатыры такія кабінеты, а ў пачатку XX стагоддзя — ужо 94 у 34 розных гарадах і мястэчках. У Гродне, напрыклад, фотаатэлье былі адкрыты Доўнарам-Запольскім, Ізраілем Садоўскім, Люцыянам Казлоўскім, у Слоніме — Вайнштэйнам па Параднай вуліцы, у Брэст-Літоўску — Віснеўскім па Мядовай вуліцы, у Ваўкавыску — Францам Выбраноўскім па Шпітальнай, у Кобрыне — Гольцманам Фішалем па Бабруйскай вуліцы. (Звесткі аб гэтым я атрымала з анлайн-крыніцы «Уся Расія — 1899, 1900, 1902, 1912. Адрас — Каляндар і Даведачная кніжка губерняў: 1907, 1914, 1915 гады».)

### Рукапісы не гараць, а негатывы захоўваюцца!

Фотаздымкі ў тыя часы наклейваліся на паспарту (бланкі), якія рабіліся з раскошнага брыстольскага кардону, на адвароце размяшчаўся фірменны малюнак, адрас фотамайстэрні, звесткі аб фатографе і яго дасягненнях на міжнародных выставах. Але некаторыя фотаатэлье ў мэтах эканоміі ставілі на паспарту просты штамп са звесткамі аб фатографе без малюнка, іншыя наогул рабілі паспарту без звестак аб фотаатэлье, а толькі з надпісам на вонкавым баку: Cabinet portrait, Souvenir ці Visit portrait.

Па даных Фатаграфічнага календара на 1891 год, фарматы паспарту мелі наступныя памеры: міньён — 40x78 мм; візітны — 65x105 ці 82x127 мм; кабінетны — 108x166 мм. Самымі распаўсюджанымі былі «кабінеткі» і «візіткі». Паспарту для іх замаўлялі ў друкарнях. Улічваць, у якой друкарні былі зроблены паспарту, нам



важна для таго, каб удакладніць дату фотаздымка, які быў на іх наклеены.

Фотаздымкі маглі дазволіць сабе заможныя людзі. Фота памерам 9x12 см каштавала амаль як чайная сярэбраная лыжка. У 1861 годзе з'явілася прапанова ў «тузінах». Групавы фотаздымак каштаваў 1 рубель 50 капеек, візітны партрэт — паўтара рублі за тузін, кабінетны — 4 рублі за паўтузіна.

У фатаграфічным працэсе ўжываліся солі золата, плаціны, рэдкіх металаў, цыяніды і ўранавыя растваральнікі, ртутныя кампаненты. Іх свабодна куплялі ў аптэках і фотамагазінах. Нездарма фотаапарат называўся фатаграфічным станком: ён быў вялікага памеру і перасоўваўся па падлозе на колах. Здымаліся па значных падзеях: дні нараджэння, шлюбы, выпуск вучэбнай установы. Твары пакрывалі тлустым слоем белай пудры і нерухома сядзелі перад камерай не менш за 20 хвілін.

Негатывы ў той час уяўлялі сабой шкляныя пласціны, на іх падчас фотаздымкі праецыраваўся адбітак, затым ён праяўляўся і фіксаваўся. Негатывы ў атэлье захоўваліся, і ў любы час можна было замовіць паўторны друк.

Дык што я расследавала пра згаданае вышэй фота маіх родных, якое зрабіў С. М. Архангельскі? Ці ўдалося мне вылічыць дату? Так.

Я знайшла інфармацыю, што фотаатэлье «Рэмбрант» па вуліцы Срэценка, д. 21, працавала з 20 верасня 1902 года да 1925 года. Але, калі прагледзела крыніцу — «Уся Масква. Адрасная і даведачная кніга. М., 1917. Раздзел «Гандлёва-прамысловыя прадпрыемствы г. Масквы і яе прыгарадаў», то выявіла зарэгістраваных па гэтым адрасе ў розныя гады іншых фатографаў (Вінклер А. Ф., Папоў І. І., Зісман А. Х.). І толькі ў адным — 1917 годзе, — нарэшце, «усплывае» прозвішча нашага С. М. Архангельскага. Гэта і ёсць той запаветны год, калі фатаграфаваліся Іона і Людзьвіка.

Дарэчы, паспарту Архангельскі замаўляў у Івана Карлавіча Гека — вядомага маскоўскага літографа, які працаваў у 1902—1918 гадах. Гэты факт, як вішанька на торце, канчаткова пацвярджае год фота. А ўвогуле, гэта быў захапляльны пошук, чаго і вам вельмі зычу!

Сапраўды, рукапісы не гараць, негатывы захоўваюцца, а памяць аб іх творцах жыве!

**Ала ЖУР.**
**Фота з сямейнага архіва аўтара.**

*(Працяг будзе.)*